Год II | Чацьвер, 26 студня 1922 г. | № 18 (27)

РАВІЦА

штодзенная грамадзкая, палітычная і літэратурная газэта

АДРЭС РЭДАКЦЫІ і КАНТОРЫ:
Вільня, Вострабрамская № 4, „Hotel Szlachecki“ пак. № 2.
Рэдакцыя адчыняна што дня, апрача сьвят, ад 11 да 1 і ад 5 да 7 гадз.

Цана нумару 20 марак.
Падпіска на 1 мес. . . 400 марак.
З перасылкай 1 „ . . 500 „
За граніцай ў два разы даражэй.

ЦАНА АБВЕСТАК:
За адзін радок звычайнага друку на 1 стр.—60 м.
ў тэксьце . . . . 75 м.
за тэкстам . . . . 40 м.
Для шукаючых працы на 10 прац. таней.

Вільня, 26 Студня 1922 г.

Дзеля таго, каб развязаць эканамічныя праблемы цяперашняга моманту, каб правесьці ў жыцьцё эўрапейскіх народаў тыя заданьня, дзеля каторых зьбіраецца міжнарадовая канфэрэнцыя ў Генуі, трэба перш усяго зьвярнуць увагу і на праблемы палітычныя.

Гэта добра разумеюць, як сам Лейд-Джордж, дык і іншыя эўрапейскія палітыкі. Тое самае можна угледзець і з той праграмы канфэрэнцыі, якая заключае ў сябе гэткія пункты: 1) спосабы найлепшэйшага ўжытку рэзалюцый, прынятых 6 студня на канфэрэнцыі ў Канах; 2) вышуканьне спосабаў для пераховы эўрапейскага міру; 3) устанаўленьне найлепшых варункаў для стварэньня паміжнарадовага давера, не парушаючы прынятых абавязкаў і 4) розныя фінансавыя пытаньня.

Ня можна спрэчацца аб тым, што другі і трэці пункты гэтай праграмы з'яўляюцца вельмі цяжкім заданьнем, над якім прыйдзецца эўрапейскім палітыкам добра паламаць галавы...

Вышукаць спосабы для пераховы Эўрапейскага міру, хоця-ж і трудна, але усё-ж пры добрых адносінах заінтэрасаваных дзяржаў, гэтае пытаньне можа быць так ці іначэй развязана.

Але як стварыць найлепшыя варункі для ўстанаўленьня давера паміж, напрыклад, Англіей і Францыей, не парушаючы Версальскага трактату?

Як стварыць давера паміж шайкай савецкіх бандытаў і цывілізаванымі Эўрапейскімі дзяржавамі, калі для гэтых бандытаў, ні якія ўмовы, ніякія міжнарадовыя законы ня маюць сілы?

Якімі спосабамі можна прымірыць праціварачывыя, адзін аднаго выключаючыя, інтэрэсы людзей, паважаючых чалавечую лічнасьць людзей ганаровых, цывілізаваных і вумных з інтэрэсамі людзей адзічаўшых, страціўшых прытомнасьць, праступнікаў?

Якое можа быць давера да палітыкі тых людзей, якія адказываюцца ад выпаўненьня імі жэ падпісаных умоў і абявязкаў, якія хочуць сілай навязаць усяму сьвету сваё дзікае азьвярэлае разуменьне чалавечага жыцьця?

Ні Лейд-Джорж, ні хто іншы з эўрапейскіх палітыкаў ня могуць вымагаць, каб была аказана давера да тых, хто жыве ашуканствам, чужой працай і чужым дабром.

✦✦✦✦

ТЭЛЕГРАМЫ.

БУХАРЭСТ 25. І. (А. В.) Румынскі парлямэнт распушчаны. Новыя выбары, трэба спадзевацца, будуць ў пачатку сакавіка.

ПАРЫЖ 25. І. (А. В.) Найвышэйшая Рада сьцьвярдзіла парадак дня Генуэнскай канфэрэнцыі, маючы ў сабе 5 пунктаў:

Вышуканьне спосабаў: 1) якімі можна правясьці ў жыцьцё пастаноў, зробляных і прынятых на пасяджэньню найвышэйшай Рацы 6 студня. 2) ўзбудаваньне праэкту спакою Еўропы па цьвёрдых падставах. 3) Праўдзівыя варункі магучыя вярнуць давера паміж гасударстваў, не чапаючы трактатаў, якія ўжо зробляны паміж імі. 4) фінансавыя справы. 5) справы гаспадарчыя і гандлёвыя.

БЭРЛІН 25. І. (А. В.) Камісыя спраў заграгічных паміж Нямеччынай і Маскоўшчынай ўжо пачала працаваць. Прадстаўнікі камісый маюць быць у Бэрліне і ў Маскве.

МАСКВА 25. І. (А. В.) Чычэрын у лісьце да Баномена паведомляе, што 27 студня мае быць пасяджэньне „В. Ц. Ц. К.“ з мэтай выбара маскоўскія дэлегатаў на Гэнуэскую канфэрэнцыю.

МАСКВА 25. І. (А. В.) З Таўрычэскай губерні паведамляюць, аб катастрафічным становішчы пасеваў, якія ў гэтым галу ледзьве раўняюцца 2 пр. пасеўнай зямлі.

ХАРКАЎ 25. І. (А. В.) Тутака гамоняць аб тым, што канцэсыя на ўкраінскія цукроўні будзе дана хаўрусу, створанаму Стінэсам, які распачне цукравую кампаньню ў найбліжшым сэзоне.

ХАРКАЎ 25. І. (А, В.) Рэзультаты ратаваньня галадаючых Украіны папярпелі фіяска.

Замест 3.500 вагонаў збожжа, якія спадзьваліся сабраць — сабрана толькі 400 вагонаў.

МАСКВА 25. І. (А. В.) Гаспадарчая рада народных камісараў сьцьвярдзіла праэкт умовы Украінскага Прамыславага Бюра з Амэрыканскім Таварыствам, аб эксплаатацыі руднікоў азбэсту на Урале (ў Алапаеўскім раёне) Канцэсыя зроблена на 20 гадоў.

Здабыча азбэсту мусіць пачацца не пазней як праз 10 месяцаў, лічучы ад момента падпісаньня ўмовы, У першы год мусіць быць здабыта ня меней, як 80.000 пудоў азбэсту; ў другі год—10000; ў трэці; — 120.000 і г, д.

За права эксплаатацыі, амэрыканскае таварыства аддае савецкаму ўраду 10 пр. агульнай здабычы азбэсту.

✦✦✦✦

Весткі з Варшавы.

На ўчарайшым пасяджэньню сойму сьцьверджана польска-нямецкая транзытовая ўмова ў справе транзыту праз Гданскі карыдор.

Чарговае пленарнае пасяджэньне сойму будзе ў пятніцу пасьля абеду.

Міністр заграгічных спраў, п. Скірмунт меў канфэрэнцыю з кардыналам Какоўскім, перад выездам польскіх кардыналаў ў Рым.

Перад пачаткам ўчарашняго пасяджэньня сойму, маршалак сойму п. Тромпчынскі выступіў з прамовай, аб памёршым папе Бэнэдыкце. У спамінах аб памёршым, ён казаў, што час понтыфікату папы будзе назаўсёды зьвязан ў гісторыі з вялікай сьвятовай вайной і з адраджэньнем Польшчы. Польскі народ ў памёршым папе, згубіў свайго прыяцела і апекуна. Нябошчык быў апекунам польскіх жаўнераў, быўшых ў няволі ў Італіі і выдаў памятную адозву, заклікаючую ўсех да зрабленьня міру.

Успамінаючы польскія справы, маршалак, звараціў ўвагу на тое, што папа быў апекунам польскага грамадзянства пад час нямецкай акупацыі. У канцы прамовы маршалак зазначыў, што памяць аб нябошчыку заўсёды будзе жыць ў памяці польскага грамадзянства і ў знак жалобы перарваў пасяджэньне на 20 хвіль.

Да сьмерці Сьвятога Айца.

У астатнія дні, прад сваей канчынай Папа Бэнэдыкт XV у выпадку блізкага часу канфэрэнцыі ў Гэнуі прыгатовіў адозву, ў якой прызываў усе народы да згоды.

Конклаў зьбярецца 2 лютага.

„А. В.“ тэлеграфуюць з Варшавы:

Па супачыўшым у Рыме Сьвятым Айцу Кардыналам Какоўскім зроблены наказ званіць па ўсіх касьцёлах хаўтурны звон, спраўляць набажэнства і гаварыць прамовы.

Супачыўшы Папа Бэнэдыкт XV завешчаў маёнтак свайму креўнаму Хеса.

Апартамэнты супакойнага Папы апарожнены, замкнуты і пры іх пастаўлена папская гвардыя. (Пат.)

Астанкі Папы у 9 гадз. 45 хв. перэнесены ў Базыліку св. Петра і выстаўлены дзеля адданьня апошняга даўга.

Прысутнымі былі кардыналы, дыпламатычны корпус, служачыя Папскага Двара і прадстаўнікі арміі. Навокола Базылікі зьбіраюцца вялікія масы народу (Пат.)

„Pat“ тэлеграфуюць з Варшавы:

„Пасьля адтрыманьня афіцыальнага паведамленьня аб канчыне Папы Бэнэдыкта XV дзеля выражэньня сабалезнаваньня адправіліся да папскага нунцыя Лаўры ад імені Начальніка Панства Генэрал Яцына, і ад імені Ураду прэзэс Понікоўскі і міністр заграгічных справаў п. Скірмунт.

Потым выразілі сабалезнаваньне заграгічныя паслы, біскупы і ксяндзы, а так сама прадстаўнікі грамадзянства.

У знак жалобы на урадавых будынках спушчаны штандары.

Асобы, якія былі прысутнымі пры канчыне Папы кажуць што Святы Айцец прасіў каб цела яго не бальзаміравалі.

Астанкі былі выстаўлены 3 дні ў троннам салі, а два дні ў Катэдры Св. Петра. (А. В.)

✦✦✦✦

З Менску.

(Ліст ў рэдакцыю).

Менск цяперашні—гэта заўсім ня той горад, якім ён быў даўней..

Цяпер гэта город на палову разбураны. Ніхто ня робіць рэмонту, найлепшыя будынкі прыйшлі ў такі стан, што

жыцьцё ў іх стала не мажэбным... Але ўсе ж людзі жывуць, трасучыся ад холаду і задыхаючыся ад дыму, бо амаль ня ўсе печы папсуты...

На вуліцах пуста. Толькі чырвонаармейцы, гуляюць, ды калі некалі па сонным вуліцам праедзе на аўто камісар... Публіка пахавалася і сядзіць у сваіх кутках, чакаючы лепшага часу, таго часу, калі зьнікне, прападзе ненавісны бальшавізм...

За тое камісары і чэкісты гуляюць. Амаль ня кожны дзень вечарынкі з музыкай, скокамі, на якія запрашаюцца вучаніцы менскіх гімназій... Ідзе нагляе распуцтва, зьдек над моладзью, над чалавечай душой...

І гэта ў той час, калі ў горадзе голад. Кожны дзень людзі, апохнучыя, абезсілеўшыя ад голаду падаюць на вуліцах.

Хворых вельмі многа. У бальніцах няма мейсца і захварэўшыя лежаць у сваіх памешканьнях без медзіцынскай помачы, без уходу, і медзікаментаў лежаць цярпліва чакаючы сьмерці..

Здаровыя,—калі яшчэ ёсьць такія ў Менску, ня маючы ў перадзі нічога пэўнага, кожны дзень чакаюць наскока банды чэкістаў, якія без уселякай віны садзяць грамадзян у склепы, мучаць і забіваюць нявінных людзей..

Навокала горада гаспадараць няўлавімыя паўстанцы,—зялёнадубцы і гора тым камісарам і камуністам, якія пападаюцца ў іх рукі!

Нядаўна ў самым горадзе на Троіцкай гары была перастрэлка з паўстанскімі разведчыкамі, якія ў трох з'явіліся ў горад на кватэру аднаго камуніста, якога ня было ў хаце, забралі ў яго паперы дакумэнты, аружжа і прыгразіўшы гаспадару гранатай выйшлі на вуліцу, тутака іх хацелі арыштаваць, але паўстанцы кінулі некалькі ручных бомбаў і, разагнаўшы чырвонаармейцаў спакойна выйшлі з гораду і направіліся к Лачойскаму шляху.

Кажуць, што над Лачойскам знаходзіцца глаўная зялёнадубская кватэра, якая пакуль што сядзіць ціха, не праяўляючы ніякай актыўнасьці. Кажуць, быццам партызанам—Зялёнадубцам прыказана стрымацца ад нападаў да вясны.

Сярод чырвонаармейцаў панічны настрой яны ня вераць у моц Савецкай уласьці і кажуць, што пры першым народным бунце кінуць аружжа, альбо перайдуць на бок народу. Адны даносяць на адных, шпэгуюць, даглядаюць за кожным крокам... Давера ні ў каго няма. Усе лічаць, што дзень падзеньня Савецкай уласьці на Беларусі ужо блізак і кожны думае аб сваёй скуры.

З Масквы затрымалі прысылку грашовых знакаў і пяпер усе савецкія служачыя сядзяць без грошаў.

Тым часам цэны на усё растуць і так хутка няудзяржыма растуць, што праз які месяц усё стала ў два разы даражэй. „Свабодная“ таргоўля ідзе ня важна тавару вельмі мала. Апроч гэтага камісары і чэкісты прывыклі браць дарма. Навет бедныя крамнікі і тыя баючыся рэпрэсый даюць хабары, а самі галадаюць.

Смертнасьць у горадзе вялікая, але сколькі людзей памірае — няведама, бо жаднай статыстыкі і рэгістрацыі ў бальшавікоў няма. Хаваюць хто як хоча і гдзе хоча, бо магільнікі усе поўныя— там ужо няма мейсца для новых пакойнікаў.

Сава.

✦✦✦✦

Прамова Лейд-Джорджа.

„Wolf“ паведамляе з Лёндыну, што Лёйд-Джорж 22 студня ў Вестмінстэрэ на канфэрэнцыі народнай лібэральнай партыі, сказаў прамову, ў якой акрэсьліў ўнутрэна-палітычную сытуацыю і далей меж іншым сказаў.

У нашым краю мы маем два мільёны безпрацоўных, а ў Злучаных штатах іх ёсьць яшчэ болей... Дзеля чаго? Дзеля таго, што хацяж на сьвеце чуецца брак нашых тавараў, але папыт на іх малы. Не можна казаць, што цэлы сьвет ня можа вытварыць багацьця, але можна запьвярдзіць, што крэдытныя апэрацыі ня могуць быць без давера.

Заданьня, якія прыняла на сябе Вялікая Брытанія і сьвет, могуць быць выражаны гэтак вельмі патрэбна узаімнае давера. Без давера ня можа быць адбудовы, бо з крэдыту няма гандлю, без гандлю—няма працы. Эканамічны пажар стаў немажэбным і банкроцтво без адпаведнай міжнароднай акцыі будзе немінучым.

Пакуль ня будзе забезпечаны мір у сьвеце, да таго часу мы будзем найболей цярпець шкоды.

Мы жадаем на нашым штандару упісаць словы: мір для добрых людзей!

Дэпламаты, якія мысьляць, што Эўропу можна аздаровіць у працягу двух трох гадоў, альбо ня добра паінфармованы аб фактычным становішчы справы, альбо вядуць грамадзянства па блуднай дарозе.

Есьць толькі адзін пэўны шлях, гэта той шлях, які кіруецца розумам,

Гэтага можна дасягнуць пры дапамозе канфэрэнцый. Калі-б у 1914 гаду была бы зроблена канфэрэнцыя для выяўленьня ўсіх непаразуменьняў — тады ня было бы усесьветнай вайны.

Каждая канфэрэнцыя есьць крок па дарозе да міра.

У Генуі адбудзецца вялікая міжнародная канфэрэнцыя. У недалекай будучыне мы маглі пачуць, што Расея вааружаецца, каб зрабіць напад на Польшчу, што Польшча робіць паўстаньне на Украіне, што Расея атакуе Румынію, а Фінляндыя Расею і гэтак далей.

Вось мы і жадаем зрабіць так каб прадстаўнікі гэтых дзяржаў глядзелі адзін аднаму ў вочы і дайшлі бы да паразуменьня.

ХРОНІКА.

Арыштаваньне Краскоўскага.

23 студня ў поўдзень арыштаваны і адпраўлены у турму на Лукішках прэз. Віленскага Беларускага Нацыянальнага Камітэту п. Краскоўскі.

Арэшты сярод Літоўцаў.

23 студня ў поўдзень застаў арыштаваны і адпраўлены ў Лукішскую турму літовец п. Мічунас.

Аукцыон.

На аддачу ў арэнду жалезнадарожн. буфэтаў на станцыях Ліда, Ваўкавыск, Чэрэмха і Слонім назначаны аукцыон.

Латэрэя абразоў.

Камітэт выстаўкі абразоў купіў дзеля латэрэі 6 абразоў вядомых польскіх мастакоў.

Лятэрэя адбудзецца 29 студня а 12 гадз. 30 м. у памешканьні Артыстаў-Пластыкаў (ул. Міцкевіча № 33)

Білеты каштуюць 1000 мар. кожны. Абразы можна разглядаць з 23 студня ў тарг. даму „Праца“ (вул. Міцкевіча 8)

Яшчэ арэшты.

Віленск. Газэты паведамляюць, што 21 студня ўвечары арыштаваны: рэдактар газэты „Nasza Ziemia“ п. Грабоўскі, п. І. Семашко і п. І. Шпак.

Вызваленьне п. Валейшы.

З ліку арыштаваных з групай „Белар. Нацыянальнага Камітэту вызвалены з турмы прэзас бел. музык-драматычнага гуртка п. Ст. Волейша.

Склікаиьне Сойму.

24 студня Прэзэс Часовай Урадовай Камісыі Сярэдняй Літвы п. Мейштовіч падпісаў гэтакі дэкрэт:

„Прадстаўнікі Віленскай Зямлі, выбраныя на падставе дэкрэту Глаўнакамандуючага Сярэдняй Літвы № 419 і прэзэса Часовай Урадовай Камісіі № 421 склікаецца ў Вільню на 1 лютага 1922 г. у Сойм, як сход дзеля выяўленьня жаданьня насяленьня.

✦✦✦✦

Тыпы Палесься.

14. Юрка Касы.

Сярод глухога непраходнага лесу збудаваў сабе князь замак, каб ніхто ня меў магчымасьці яму пярэчыць і перашкаджаць у яго справах. Была ў яго шмат замкаў. Пабудаваў ён гэты замак тутака, як кажуць, дзеля таго, каб у ім жыла яго красавіца-жонка, якая, як думаў князь, здрадзіла яму, і вось ён засадзіў сюды жонку і чакаў, пакуль яна родзіць дзіця.

Радзіўся хлопчык. Князь прыказаў свайму дварэцкаму занесьці дзіця ў лес і кінуць тамака на з'ядзеньне ваўкам, а сам, сабраўшы сваіх верных халопаў, выехаў, пакінуўшы жонку ў замку, даўшы наказ, каб сьцераглі яе.

Але як там здарылася, толькі праз гады два прыехаў нейкі ваяка, і украў жонку князя.

Кажуць, што жонку ўкраў ад яго нейкі заморскі цар. Праз гадоў пяць пасьля гэтага прыехаў князь.

Даведаўшыся, што яго жонку ўкралі, ён пачаў мсьціцца на людзёх.

Уся вокружнасьць стагнала ад князя. Ня была ні праходу ні праезду нікому.

Князь гуляў ў ваўсю, і навет ня шкадаваў людзей, дзеля забавы. Ен скаваў людзей сабакамі, трымаў ваўкоў, каб пасьля моцна іх здрачыўшы, выпускаць на людзей.

Завёў для пацехі сваёй шмат дзяўчат, якіх пасьля пацехі аддаваў сваім слугам, а пасьля аддаваў зьверам на яду.

Людзі бяжалі бяз аглядку ад замку. Пры адным успаміну аб князю, людзі ўцякалі ў лясы, і там хаваліся...

Але вось пайшла вестка, што зьявіўся нейкі чалавек, які ідзе, каб пакараць князя за ўвесь зьдзек над людзьмі.

Гэта чалавек быў Юрка Касы. Пачуў і князь аб гэтым чалавеку. Часамі яго браў страх, але кожны дзень хмяльны ён ня даваў віду, што нейкі страх браў яго.

Вось раз калі князь накадзіў вялікі баль і гасьцёў была шмат, князь асабліва вёў самыя найгоршыя забавы.

Напрыклад ён абмазаў смалой некалькі дзяўчат і падпаліў іх.

Пьяныя госьці рагаталі, а бедныя дзяўчата кінуліся ў ваду, і ўтапіліся. Вось, калі ўсіх адалеў сон, князь сядзеў ўпацёмках у сваім пакою. Сон ня браў яго. А ў той самы час, калі князь гуляў, да замка прыблізіўся Юрка Касы з сваіма сябрамі. Людзі яго чулі, як енчылі замучаныя князям людзі, і прыбеглі сказаць аб гэтым свайму атаману. І вось той сказаў: „Браты! Сёньня павінен быць суд над князям. Гэты суд будзе Божым... Я сам пайду даведацца, як нам будзе лягчэй дабрацца да замка. І ён, узяўшы аднаго свайго чалавека пайшоў ў замак. Вось ён забраўся ў сад замковы і пачаў красьціся да вакна. Сьвяціў месяць. У гэты міг князь сядзеў ў сваім пакоі, як раптам угледзеў, што нейкая цень прамільгнула ля вакна.

Ен паклікаў свайго дварэцкага і даў наказ, каб злавіць таго, хто меў права быць у парку ў гэты позьні час. Слугі пайшлі.

Загрухацелі стрэлы. Праз хвілю ў залю ўвялі Юрку Касога.

„Вось-казаў стары дварэцкі — вось чалавека гэтага злавіла стража. Адзін яго сябар уцёк“.

Глянуў на яго Князь, дый кажа: „Хто ты такі сьмелы чалавечэ, што адважыўся цябе запытаць, хто даў табе правы зьдзекавацца без літасьці над людзьмі? Я прыйшоў спытаць цябе аб гэтым і судзіць!“

— „Як, мяне судзіць?!“ князь.

„Ты маеш права пытаць?! Вось я табе пакажу! Зьвязаць яго і ў склеп!“ скамандаваў князь.

„А ты дварэцкі. Крыкнуў ён да дварэцкага, які стаяў зьбялеўшы гледзючы на Юрку, –пастаў стражу, каб нікога ня дапускаць да гэтага склепу...“

Ніхто не прыкмеціў, як стары Дварэцкі шапацеў.

„Божа літасьцівы! Гэтаж яго дзіця!“

Юрку павялі.

А князь хадзіў, лаючыся па пакоі.

Нарэшці выпіў мёду, сеў ў крэсла, дзе і заснуў.

Тым часам дварэцкі, які пазнаў ў Юрцы сына князя зрабіў так, што той ўцёк.

Князь спаў, раптам адкрылася вакно, і ў пакой ўлез Юрка. Ен агледзеўся і ўбачыў князя. Хацеў забіць яго, але пасьля разьмеркаваў, і забраўшы ў князя з-за пояса шаблю і пістолі, ўцёк, напісаўшы князю ліст.

Толькі ўцёк з пакою Юрка, як усхопіцца князь, ды закрычыць. „Дзяржыце яго! Дзяржыце! Агня!“ Прыбеглі спужаныя людзі з сьвечкамі, глядзяць. Князь трымае нейкую паперу ў руцэ. „Чытай!“ грозна сказаў князь, даючы дварэцкаму паперу. Той прачытаў: „Выбачай, князь, што ня будзіў. Замест сваіх пістолетаў і шаблі, якія ад мяне забралі твае людзі, бяру твае.

Да пабачаньня!“ Як толькі дачытаў гэта дварэцкі, як схопе князь яго за горла.

„Дык ён уцёк, а я хацеў над ім паджартаваць! Хацеў, каб мае госьці пагладзелі, як князь частуе тых, хто хоча яго судзіць! І я лішыўся гэтае прыемнасьці! Як ты замыкаў яго?“ павадзіўся ён на старага дварэцкага.

Зьбіўшы старыка ён крыкнуў: „Пасадзеце яго замест таго злодзея!“

Зьбітага старыка павялі, і ашалелы князь хадзіў па пакою....

Раптам са ўсіх бакоў загрукалі стрэлы, пачаўся крык, і ў пакой ўляцелі нейкія аружныя людзі. Князь ад несладзеўкі так спужаўся, што думаў, што гэта нядобры сон, але вось увайшаў Юрка і сказаў:

„Вось і я, пане Князю, выбачайце што ўйшоў тады без вашага ведама, але вось, як бачыце, прыйшоў за вашым адказам на мае пытаньне!“

„Хто ты?“ запытаў яго князь.

„Я той, хто сабраў, прымеціў тых людзей, якія беглі ад твайго зьдзеку, я той, хто карае ўсіх тых, якія ўвесь свой век пьюць, ядуць, нічога ня робяць і жывуць чужой кроўю, чужой працай, потам... Я Юрка Касы!“

Прагрымеў на яго запытаньне Юрка.

Праз хвілю ў пакай прынясьлі зьбітага старыка Дварэцкага, і палажылі яго на падлогу.

„Слухайце людзі!“ ледзьве прагаманіў стары.

„Слухайце людзі!—пачаў ён гэта сын Князя!“ паказаў ён рукой на Юрку. „Калі ён радзіўся, князь думаючы, што гэта ня яго сын, сказаў мне, каб я яго кінуў ваўкам, але я аддаў дзіця свайму брату, каб той выхаваў яго ў сябе. А цяпер, цяпер, выбачай князь, я выпусьціў яго, я ня хацеў каб ты быў сынаўбійцам.

„Гэта твой сын!“ сказаўшы гэтыя словы, старык упаў няжывы.

„Што я чую!“ шаптаў зьбялеўшы князь. „Мой сын! Гэта мой сын! Не ня можа быць! ты брэшаш, старык кінуўся ён да старыка, але Юрка заградзіў яму дарогу.

„Стрымай князь!“ спакойна сказаў ён. „Гэта суд Божы над табой і мной!“ Ніхто ня прыкмеціў, як князь выбраў з-за пояса пістоль, і раптам выстраліў ў Юрку з славамі: „Умры, хоць ты і сын!“ Кінуліся людзі да падаючага Юркі, а вошта да князя.

„Стрымайце сказаў ранены ў грудзі Юрка.

„Слухай, князь! Я даю табе гэты стрэл!

Памятай—хоць па маей сьмерці—зьмяні жыцьцё!“... І цуда зрабілася, князь кінуў пістоль, кінуўся на калені прад Юркай і схапіў яго за ногі.

„Сын, сын! Даруй бацьку! плакаў ён, а Юрка ціха ўміраў.

„Даруй, сынок, даруй!“ плакаў бацька.

Юрка маўчаў, пасьля апошні раз падняў вочы у гару і сказаў:

„Дарую!“ і аддаў душу Богу. З таго часу зьмяніўся князь. Раздаў ўсю зямлю сялянам, адстроіў спаленыя вёскі, сабраў ўсіх хворых і бедакоў да замка і быў айцом для ўсіх. Калі прыйшла яго кончына, шмат людзей плакала па ім, і па яго завету пахавалі яго пасярод магілак Юркі і старыка Дварэцкага, які быў другім бацькам Юркі.

Караба скончыў. Крупень быў гатовы. Але ніхто ня браўся за яду. Усе былі пры сваіх думках.

„Чаго зажурыліся?“ вясёла загаманіў Караба.

Гэта ўсё прайшло, вось крупень стыне!...“ казаў ён, дастаючы лыжкі.

„Прынімайцеся!“ скамандаваў ён, і мы прыняліся есьці.

Вечар ужо надходзіў, калі мы пайшлі далей.

„Абы да хутара Базыля дабрацца, а там заначуем!“ казаў Ганчар.

Хутка мы выйшлі на грэблю, па якой мусіць мала хто хадзіў, а мо мала хто і ведаў пра яе істнаваньне.

Дзяргач.

Рэдактар-Выдавец: Вацлаў Адамовіч

Друкарня „Друк“ Субач 2.